УДК 94(476)

**А. С. Горны**
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы

# БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У МІЖВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў АДЛЮСТРАВАННІ СУЧАСНАЙ ЗАМЕЖНАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ*

Для падрыхтоўкі комплекснага даследавання па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі актуальнымі з'яўляюцца веды пра тэарэтычныя падыходы замежных гісторыкаў з мэтай параўнальнага аналізу. У артыкуле праводзіцца характарыстыка сучасных здабыткаў замежнай гістарычнай навукі ў гэтым накірунку. Аўтар разглядае працы такіх польскіх даследчыкаў, як В. Сляшынскі, Я. Мірановіч, А. Глагоўская, М. Мароз, раскрывае іх погляды на палітычныя напрамкі беларускага руху, яго грамадскую актыўнасць і значэнне для развіцця агульных палітычных працэсаў у міжваеннай Польшчы. Падкрэсліваецца трэнд сучаснай польскай гістарыяграфіі ў вывучэнні асобных рэгіёнаў міжваеннай Польшчы і нацыянальных працэсаў у іх. Акрамя гэтага, разглядаецца сучасная літоўская гістарыяграфія, працы расійскіх даследчыкаў, прысвечаныя этнапалітычным працэсам у Заходняй Беларусі. Падаецца характарыстыка прац двух сучасных англамоўных аўтараў – шведскага гісторыка Пер Андэрса Рудлінга і японскага гісторыка Мічыхіра Ясуі.

У заключэнні аўтар прыходзіць да высноў, што ў сучаснай польскай гістарыяграфіі працягваюць паўтараць ранейшы памылковы тэзіс аб слабасці і нядзеяздольнасці беларускага руху ў Заходняй Беларусі, у літоўскай гістарыяграфіі назіраецца ігнараванне беларускага фактару ў вывучэнні гісторыі міжваеннага перыяду, у расійскай і англамоўнай гістарыяграфіі па-ранейшаму беларускі рух у Заходняй Беларусі не стаў асобным аб'ектам для даследавання.

**Ключавыя словы**: беларускі нацыянальны рух, Заходняя Беларусь, міжваенная Польшча, нацыянальныя працэсы, гістарыяграфія.

**Для цытавання:** Горны А. С. Беларускі нацыянальны рух у міжваеннай Заходняй Беларусі ў адлюстраванні сучаснай замежнай гістарыяграфіі // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 2 (275). С. 66–71. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-275-2-12.

**A. S. Gorny**
Yanka Kupala State University of Grodno

# BELARUSIAN NATIONAL MOVEMENT IN INTERWAR WESTERN BELARUS IN THE REFLECTION OF MODERN FOREIGN HISTORIOGRAPHY

It is necessary to know the theoretical approaches of foreign historians in order to prepare a comprehensive study on the history of the Belarusian national movement in interwar Western Belarus. The article describes the modern achievements of foreign historical science in this direction. The author of the article examines the works of such Polish researchers as V. Slyashinsky, J. Miranovich, A. Glahouskaya, M. Maroz. It reveals their views on the political directions of the Belarusian movement, its social activity and significance for the development of general political processes in interwar Poland. He also notes the tendency of modern Polish historiography in the study of different regions of interwar Poland and national processes in them. In addition, the author examines modern Lithuanian historiography, the works of Russian researchers devoted to ethnopolitical processes in Western Belarus. The researcher describes the works of two modern English-language authors – the Swedish historian Per Anders Rudling and the Japanese historian Michihiro Yasui.

In conclusion, the author comes to the conclusion that modern Polish historiography continues to repeat the previous wrong thesis about the weakness and incapacity of the Belarusian movement in Western Belarus; in Lithuanian historiography, the Belarusian factor in the study is ignored. From the history of the interwar period in Russian and English-language historiography, the Belarusian movement in Western Belarus has not yet become a separate object of study.

**Keywords:** belarusian national movement, Western Belarus, interwar Poland, national processes, historiography.

**For citation**: Gorny A. S. Belarusian national movement in interwar Western Belarus in the reflection in the reflection of modern foreign historiography. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 2 (275), pp. 66–71. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-275-2-12 (In Belarusian).

*Артыкул падрыхтаваны ў рамках гранта Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў № Г23ИП-036 «Грамадска-палітычнае развіццё Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) у замежнай гістарыяграфіі».

**Уводзіны.** Гісторыя беларускага нацыянальнага руху з’яўляецца неад’емнай часткай гістарычных працэсаў у міжваеннай Заходняй Беларусі. Дзейнасць беларускіх палітычных і культурна-асветніцкіх арганізацый прывяла да разгортвання масавага нацыянальнага руху супраць палітыкі паланізацыі і нацыянальнага ўціску, у якім прымалі ўдзел тысячы актывістаў з розных заходнебеларускіх рэгіёнаў. Дадзеная з'ява набыла значную традыцыю адлюстравання ў айчыннай гістарычнай навуцы, у першую чаргу ў навуковых працах, прысвечаных міжваеннай гісторыі. У той жа час актуальнай на сёння з’яўляецца падрыхтоўка абагульняючага даследавання па гэтай праблеме, у якім будуць акумуляваны асноўныя тэарэтычныя і факталагічныя здабыткі беларускай гістарыяграфіі ў гэтым накірунку.

Пры падрыхтоўцы комплекснага даследавання па гісторыі беларускага руху ў Заходняй Беларусі нельга не ўлічваць навуковыя напрацоўкі замежных даследчыкаў. У першую чаргу тут неабходна вылучыць польскую гістарыяграфію, у рамках якой была падрыхтавана значная колькасць рознабаковых даследаванняў па гісторыі міжваеннай Польшчы і яе нацыянальных меншасцяў. Таксама гэтая тэматыка ў той ці іншай ступені ўзнімалася ў іншых краінах, дзе naзіралася развіццё беларусазнаўчых даследаванняў. Працягваюцца гэтыя працэсы і цяпер. Таму сучаснаму пакаленню беларускіх даследчыкаў вельмі важна ведаць асноўныя тэарэтычныя падыходы замежных гісторыкаў, рабіць параўнальны аналіз выкарыстання факталогіі і раскрываць як моцныя, так і слабыя бакі падрыхтаваных прац, каб пазбегнуць суб'ектыўных ацэнак ва ўласных даследчыцкіх праектах.

**Асноўная частка**. Як было ўжо падкрэслена вышэй, значны матэрыял па гісторыі беларускага руху ў міжваеннай Польшчы назапасіла польская гістарычная навука. У 2000-я гг. у ёй заяўляе пра сабе цэлы шэраг даследчыкаў, якія займаюцца праблематыкай так званых «крэсаў усходніх» у міжваенны перыяд, выкарыстоўваючы не толькі дакументы з польскіх архіваў, але і з беларускіх, літоўскіх, украінскіх і расійскіх дакументасховішчаў. Прыкладам такога могуць выступаць працы вучонага з Беластока Войцеха Сляшынскага [1]. Адной з важных тэм, якую закранаў гісторык, была арганізацыя ўнутранай бяспекі польскімі органамі ўлады ў Заходняй Беларусі і супрацьдзеянне нелегальным формам дзейнасці беларускага руху. В. Сляшынскі на падставе рознабаковых крыніц даследаваў механізмы барацьбы польскіх органаў бяспекі з антыпольскім партызанскім рухам і падпольнай актыўнасцю Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), якую, між іншым, адносіў не да нацыянальных арганізацый, а да ўніверсальных камуністычных партый. Яго агульная ацэнка беларускага руху ў міжваеннай Польшчы захоўвала ранейшыя высновы польскай гістарыяграфіі аб слабасці і залежнасці ад знешніх фактараў.

Адным з найбуйнейшых прадстаўнікоў сучаснай польскай беларусістыкі з’яўляецца гісторык і біёграф Алена Глагоўская (Казлоўская). У сваіх навуковых і навукова-папулярных працах яна ў тым ліку даследавала працэсы развіцця беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці ў міжваенны перыяд. Так, у манаграфіі «Польска-беларускія адносіны ў XX стагоддзі» даследчыца прапанавала ўласную перыядызацыю развіцця палітыкі Польшчы адносна беларусаў у 1921–1939 гг. У адрозненне ад многіх польскіх гісторыкаў Глагоўская бачыла пэўны патэнцыял у дзейнасці розных беларускіх нацыянальных структур, якія, аднак, быў нівеліяваны асіміляцыйнай палітыкай польскіх улад, якую яна ацэньвае вельмі негатыўна [2, s. 169–231].

Праблематыка дзейнасці беларускіх нацыянальных структур у міжваеннай Польшчы закраналася ў працах сучаснага польскага даследчыка беларускага паходжання Яўгена Міратовіча. У рамках вывучэння палітыкі польскіх улад адносна беларускага насельніцтва даследчык вызначыў месца ў гэтых працэсах беларускіх актывістаў і нацыянальных структур, такіх, як КПЗБ, Таварыства беларускай школы (ТБШ), Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) і інш. На думку Мірановіча, канкурэнцыя паміж беларускімі левардыкальнымі і нацыянальна-дэмакратычнымі арганізацыямі не давала магчымасці стварыць моцны палітычны рух, што актыўна выкарыстоўвалі польскія ўлады для вырашэння «беларускай праблемы» і далейшага правядзення палітыкі паланізацыі [3, s. 80].

Вядомым спецыялістам па гісторыі беларускага руху ў Заходняй Беларусі у сучаснай польскай гістарыяграфіі з’яўляецца даследчыца Маўгажата Мароз (Ацытка). Аб’ектам яе даследаванняў былі ў асноўным нацыянальна-дэмакратычныя структуры беларускага руху. У кнізе, прызвечанай газеце «Крыніца», гісторык зрабіла не столькі прэсазнаўчы аналіз, колькі раскрыла кантэкст фарміравання ідэалогіі беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў, паказала асноўныя накірункі дзейнаснасці БХД і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК), у першую чаргу ў віленскім асяроддзі беларускай інтэлігенцыі [4].

Асаблівасцю сучаснай польскай гістарыяграфіі з’яўляецца актыўная ўвага гісторыкаў да рэгіянальных працэсаў і лакальна-гістарычных з’яў у міжваеннай Польшчы. Тэма так званых «усходніх крэсаў» перастала быць цэласным аб’ектам вывучэння, польскія даследчыкі спрабуюць разбіць гэты рэгіён на пэўныя часткі, абапіраючыся на тагачасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны

падзел. Сярод падобных даследаванняў вылучаецца праца палітолага і гісторыка Яцэка Ягуся «Беларускае насельніцтва Навагрудскага ваяводства II Рэчы Паспалітай ва ўспрыманні польскіх эліт рэгіёну». Разглядаючы беларускі нацыянальны рух у Польшчы, Ягусь значна спрасціў праблему і звёў яе да існавання ўсяго двух замкнёных накірункаў – камуністычнага і хрысціянска-дэмакратычнага [5, s. 63]. Паўтараліся старыя ацэнкі польскай гістарыяграфіі аб тым, што беларусы стварылі найменшую колькасць партый і арганізацый сярод усіх меншасцяў міжваеннай Польшчы. Таксама аўтар зноў агучваў тэзіс аб тым, што беларускі рух у Заходняй Беларусі меў пераважна сацыяльную арыентацыю, а не нацыянальную. Сцвярджалася, напрыклад, што нібыта пасля роспуску Грамады вынікі яе існавання для нацыянальнай свядомасці беларусаў былі мізэрнымі [5, s. 59]. Пры гэтым дадзеная думка аўтара базіравалася хутчэй на поглядах тагачасных польскіх эліт рэгіёну, чым на ўласна беларускім матэрыяле, які наўпрост ігнараваўся. У рабоце ўвогуле не былі выкарыстаны матэрыялы з беларускіх архіваў, што значна абмежавала яе фактысную вартасць.

Міжваенная Віленшчына стала прадметам вывучэння Іааны Янушэўскай-Юркевіч, даследчыцы з універсітэта ў Катавіцах. У сваёй манаграфіі яна, сярод іншага, закранула і дзейнасць беларускіх структур у гэтым рэгіёне. На аснове значнай крыніцавай базы з Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літвы было прааналізавана становішча беларускага насельніцтва ў Сярэдняй Літве, разгледжаны феномен Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), ахарактарызавана дзейнасць некамуністычных і праўрадавых беларускіх арганізацый. Аўтар сцвярджала, што ў міжваенны перыяд сярод беларускіх эліт пачалі праяўляцца тэндэнцыі прызнання польскай дзяржаўнасці і пашырэння арганічнай працы, аднак гэты кірунак атрымаў палітычнае паражэнне, дзякуючы ўнутраным і знешнім фактарам [6, s. 662]. Заўважым, што ў манаграфіі Янушэўкай-Юркевіч пры разглядзе структур беларускага руху фактычна была праігнаравана КПЗБ.

Трэндам сучаснай польскай гістарыяграфіі стала вывучэнне Палескага ваяводства, дзе ў міжваенны перыяд польскія ўлады праводзілі цэлы комплекс мер па інтэграцыі рэгіёна ў польскую дзяржаву. У дадзеных даследаваннях акцэнт у першую чаргу зроблены на праблемах фарміравання польскага адміністрацыйнага апарату на Палессі, на правядзенні эканамічнай мадэрнізацыі, развіцці польскай асветніцкай палітыкі. Аднак разам з гэтым былі спробы аналізаваць заблытаныя нацыянальныя пытанні палескага рэгіёна. У 2014 г. згаданы вышэй спецыяліст па Заходняй Беларусі Сляшынскі В. выдаў кнігу «Палескае ваяводства». Сярод аналізу палітычных і эканамічных фактараў існавання тагачаснага Палесся ён зрабіў невялікі агляд мясцовых нацыянальных рухаў. Адносна беларусаў быў паўтораны агульны тэзіс польскіх даследчыкаў – беларуская дзейнасць у Палескім ваяводстве была слабой, а мясцовых сялян цікавілі не нацыянальныя, а пераважна эканамічныя праблемы [7, s. 82].

Значны ўклад у даследаванне гісторыі Палесся зрабіў сучасны польскі даследчык Пётр Ціхарацкі. Ён з'яўляецца аўтарам грунтоўнай працы, прысвечанай палітычнаму жыццю ў Палескім ваяводстве ў міжваенны перыяд. П. Ціхарацкі не абышоў увагай і беларускія нацыянальныя арганізацыі, разгледзеўшы існаванне гурткоў БСРГ у ваяводстве і дзейнасць беларускіх актывістаў падчас выбарчых кампаній у польскі парламент. У прыватнасці, гісторык паспрабаваў адысці ад агульнапрынятага тэзіса польскай гістарыяграфіі аб эканамічных падставах развіцця беларускага руху ў Заходняй Беларусі і падкрэсліў, што пашырэнне гурткоў БСРГ было абумоўлена нацыянальнымі фактарамі, на што не звяртала ўвагу мясцовае кіраўніцтва [8, s. 214]. Аналіз функцыянавання пракамуністычнага дыскурсу ў Палескім ваяводстве і пашырэння левардыкальных ідэй П. Ціхарацкі вынес у асобнае даследаванне, у якім прысутнічае значны фактаалагічны матэрыял пра мясцовыя структуры КПЗБ [9].

Беларускі нацыянальны рух міжваеннага перыяду меў пэўную традыцыю адлюстравання ў літоўскай гістарычнай навуцы. У прыватнасці, у савецкі перыяд літоўскія гісторыкі імкнуліся грунтоўна прааналізаваць дзейнасць структур Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі на тэрыторыі Віленшчыны. У 1978 г. разам з беларускімі калегамі быў рэалізаваны нават сумесны выдавецкі праект – зборнік дакументаў і матэрыялаў «Революционное движение в Вильнюсском крае 1920–1940» [10]. Аднак пасля 1991 г. у літоўскай гістарыяграфіі тэматыка беларускага руху на тэрыторыі міжваеннай Віленшчыны не атрымала свайго развіцця. Больш таго, сучасныя літоўскія гісторыкі нават пры разглядзе нацыянальных працэсаў у міжваеннай Вільне фактычна цалкам ігнаруюць беларускі фактар [11, p. 150]. Выключэннем можа быць шэраг артыкулаў літоўскага журналіста В. Жэймантаса аб беларускіх дзеячах культуры, якія працавалі ў Вільне і міжваеннай Заходняй Беларусі ў цэлым [12].

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі працэсы нацыянальнага развіцця беларускага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы не сталі прадметам комплексных даследаванняў, што стварае пэўную перспектыву для расійскіх навуковых цэнтраў беларусістыкі ў будучыні. Некаторыя аспекты развіцця нацыянальнай свядомасці беларусаў у міжваеннай Польшчы, праблемы ажыццяўлення

палітыкі паланізацыі закранаў у сваіх працах даследчык Мікалай Маркелаў, які пры аналізе нацыянальных пытанняў у Заходняй Беларусі выкарыстоўваў метадалогію французскіх даследаванняў [13]. Асобныя сюжэты біяграфіі дзеячаў беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, а таксама погляды нямецкіх міжваенных палітычных колаў на беларускае пытанне ў Польшчы былі адлюстраваны ў працах гісторыка Ігара Барынава [14].

Гісторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд як інтэгральная частка беларускай гісторыі з'яўлялася аб'ектам вывучэння сучасных гісторыкаў, якія былі прадстаўнікамі англамоўнай навуковай прасторы. Знакавай працай сучаснага замежнага беларусазнаўства можна лічыць манаграфію шведскага гісторыка Пэра Рудлінга, выдадзеную ў Піцсбургу ў 2015 г. Трэба адзначыць, што ў адрозненне ад папярэдніх прац замежных даследчыкаў, пры падрыхтоўцы сваёй кнігі Рудлінг карыстаўся не толькі здабыткамі гістарыяграфіі, але і дакументамі з беларускіх і літоўскіх архіваў. Асобны раздзел гэтай працы прысвечаны аналізу развіцця беларускага нацыянальнага праекта ў Заходняй Беларусі. У ім шведскі гісторык робіць акцэнт на вывучэнні дзейнасці дзвюх заходнебеларускіх палітычных арганізацый – БХД і БСРГ. Ідэалогію БХД ён разглядае як спалучэнне ідэй лібералізму, нацыяналізму, хрысціянскага ідэалізму, змешаных з сацыялістычнымі ідэямі кааперацыі і пераразмеркаваннем зямлі, якія набылі папулярнасць у асяроддзі беларускай інтэлігенцыі [15, p. 183]. Тым не менш, на думку Рудлінга, у беларускім палітычным жыцці ў Заходняй Беларусі дамінаваў так званы «левы нацыяналізм», увасабленнем якога была БСРГ і іншыя левaрадыкальныя арганізацыі [15, p. 189–190]. Нягледзячы на значныя тэарэтычныя абагульненні, праведзеныя гісторыкам, у яго кнізе прысутнічаюць некаторыя хібы і недакладнасці. Напрыклад, пэўнае неразуменне выклікае дата 1931 г. як крайняя храналагічная рамка даследавання.

Адной з апошніх публікацый па гісторыі беларускага руху ў Заходняй Беларусі ў англамоўнай навуковай прасторы можна лічыць артыкул японскага даследчыка Мічыхіра Ясуі «Дзень Грамады ў польскім Сейме. Беларускі нацыянальны рух падчас ранняга рэжыму санацыі». У артыкуле гісторык сканцэнтраваў увагу на праблеме ліквідацыі БСРГ у 1927 г. праз прызму адной падзеі – галасаванні ў польскім Сейме наконт пазбаўлення дэпутацкай недатыкальнасці паслоў парламенцкага клуба БСРГ. Каштоўнасцю артыкула можна лічыць грунтоўны аналіз польскага перыядычнага друку, на аснове якога японскі гісторык спрабуе прасачыць адносіны польскіх палітычных і інтэлектуальных эліт да развіцця беларускага нацыяналізму ў часы станаўлення санацыйнага рэжыму [16].

**Заключэнне.** Пры падвядзенні вынікаў неабходна заўважыць, што ў сучаснай замежнай гістарыяграфіі распрацавана значная колькасць даследаванняў, у якіх у той ці іншай ступені аналізуецца беларускі нацыянальны рух у міжваеннай Заходняй Беларусі. Аднак узровень аналізу ў гэтых працах з'яўляецца неаднародным. Сучасныя польскія даследчыкі паўтараюць старыя тэзісы польскай гістарыяграфіі аб слабасці ці нават маргінальнасці беларускага руху, адсутнасці ў ім выразных ідэалагічных напрамкаў, яго залежнасці ад знешняга фактару, у першую чаргу савецкага. Беларусы ў міжваенны перыяд, ва ўяўленні большасці польскіх гісторыкаў, мелі слабую нацыянальную ідэнтычнасць і былі няздольныя арганізаваць моцны нацыянальны рух. Правядзенне комплекснага даследавання ў гэтым накірунку сучаснымі беларускімі гісторыкамі дазволіць паказаць памылковасць гэтых поглядаў. Праўда, сярод прадстаўнікоў польскай гістарыяграфіі сустракаюцца гісторыкі, якія бачылі патэнцыял развіцця беларускага руху, што быў стрыманы асіміляцыйнай палітыкай улад.

У сучаснай літоўскай гістарыяграфіі назіраецца тэндэнцыя ігнаравання беларускага фактару ў даследаванні нацыянальных працэсаў у Віленскім рэгіёне ў міжваенны перыяд, што робіць такія даследаванні абмежаванымі і суб'ектыўнымі. Беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі не стаў прадметам асобных даследаванняў у расійскай гістарыяграфіі, дзе ён разглядаецца ў рамках вывучэння больш шырокіх этнапалітычных працэсаў у міжваенны перыяд. Прадстаўнікі англамоўнага гістарычнага дыскурсу таксама разглядаюць дадзеную праблематыку ў спалучэнні з іншымі аспектамі гісторыі найноўшага перыяду. Значным недахопам іх прац з'яўляецца ігнараванне здабыткаў беларускай гістарыяграфіі як з пункту гледжання факталогіі, так і тэарэтычных напрацовак.

**Спіс літаратуры**

1. Śleszyński W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. Warszawa: RYTM, 2007. 400 s.

2. Głogowska H. Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku. Białystok: Wydawnictwo UwB, 2012. 678 s.

3. Mironowicz E. Białorusini i ukraińcy w polityce obozu piłsudczykowskiego. Białystok: Trans Humana, 2007. 294 s.

4. Moroz M. «Krynica»: ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu. Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2001. 230 s.

5. Jaguś J. Ludność białoruska województwa nowogródzkiego II Rzeczypospolitej w percepcji polskich elit regionu. Toruń: Wyd. Adam Marszałek, 2014. 276 s.

6. Januszewska-Jurkiewicz J. Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939. Katowice: Wyd. Uniwersytetu Śląskiego, 2010. 710 s.

7. Śleszyński W. Województwo Poleskie. Kraków: Avalon, 2014. 336 s.

8. Cichoracki P. Województwo poleskie 1921–1939. Z dziejów politycznych. Łomianki: LTW, 2014. 478 s.

9. Cichoracki P. Komuniści na Polesiu w latach 1921–1939. Łomianki: LTW, 2016. 273 s.

10. Революционное движение в Вильнюсском крае: документы и материалы / сост.: В. Канцявичюс [и др.]. Вильнюс: Минтис, 1978. 448 с.

11. Mačiulis D., Staliūnas D. Vilnius – lietuvos sostinė: problema tautinės valstybės projekte (XIX a. pabaiga – 1940 m.). Vilnius: LII leidykla, 2015. 324 p.

12. Žeimantas V. Adomas Stankevičius – kunigas, rašytojas, baltarusių atgimimo veikėjas // XXI amžius. 2009. Nr 80. P. 4.

13. Маркелов Н. А. Межэтнические отношения белорусов и поляков в условиях формирования новой государственной идентичности в 1921–1939 гг. // Ученые записки Казанского университета. Серия: Гуманитарные науки. 2017. Т. 159, кн. 4. С. 1019–1027.

14. Баринов И. И. Белоруссия и белорусы в антипольской стратегии Германии (1915–1939 гг.) // Славянский альманах. 2022. № 1–2. С. 28–47.

15. Rudling Per Anders. The rise and fall of Belarusian nationalism, 1906–1931. Pittsburgh: University of Pittsburgh Press, 2015. 436 p.

16. Yasui Michihiro. "Hromada's Day" in the Polish Sejm (Feb. 4, 1927). The Belarusian national movement under the early Sanacja Regime // Гісторыя Беларусі ў XX стагоддзі. Памяці прафесара Івана Коўкеля: зб. навук. арт. / пад рэд. А. Горнага. Гродна: ЮрсаПрынт, 2017. С. 67–92.

## References

1. Śleszyński W. *Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej* [Internal security in the policy of the Polish state in the north-eastern territories of the Second Polish Republic]. Warsaw, RYTM Publ., 2007. 400 p. (In Polish).

2. Głogowska H. *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku* [Polish-Belarusian relations in the 20th century]. Bialystok, UwB Publ., 2012. 678 p. (In Polish).

3. Mironowicz E. *Białorusini i ukraińcy w polityce obozu piłsudczykowskiego* [Belarusians and Ukrainians in the politics of the Piłsudski camp]. Bialystok, Trans Humana Publ., 2007. 294 p. (In Polish).

4. Moroz M. *"Krynica": ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu* [«Krynica»: ideology and leaders of Belarusian Catholicism]. Bialystok, Białoruskie Towarzystwo Historyczne Publ., 2001. 230 p. (In Polish).

5. Jaguś J. *Ludność białoruska województwa nowogródzkiego II Rzeczypospolitej w percepcji polskich elit regionu* [The Belarusian population of the Nowogródek Voivodeship of the Second Polish Republic in the perception of the Polish elites of the region]. Torun, Wyd. Adam Marszałek Publ., 2014. 276 p. (In Polish).

6. Januszewska-Jurkiewicz J. *Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939* [National relations in the Vilnius region in the years 1920–1939]. Katowice, Wyd. Uniwersytetu Śląskiego Publ., 2010. 710 p. (In Polish).

7. Śleszyński W. *Województwo Poleskie* [Polesie Voivodeship]. Krakow, Avalon Publ., 2014. 336 p. (In Polish).

8. Cichoracki P. *Województwo poleskie 1921–1939. Z dziejów politycznych* [Polesie Voivodeship 1921–1939. From political history]. Lomianki, LTW Publ., 2014. 478 p. (In Polish).

9. Cichoracki P. *Komuniści na Polesiu w latach 1921–1939* [Communists in Polesie in 1921–1939]. Lomianki, LTW Publ., 2016. 273 p. (In Polish).

10. *Revolyutsionnoye dvizheniye v Vil'nyusskom kraye: dokumenty i materialy* [Revolutionary movement in the Vilnius region: documents and materials]. Comp.: V. Kancyavichyus [et al.]. Vilnius, Mintis Publ., 1978. 448 p. (In Russian).

11. Mačiulis D., Staliūnas D. *Vilnius – lietuvos sostinė: problema tautinės valstybės projekte (XIX a. pabaiga – 1940 m.)* [Vilnius – the capital of Lithuania: a problem in the nation-state project (end of the 19th century end – 1940)]. Vilnius, LII leidykla Publ., 2015. 324 p. (In Lithuanian).

12. Žeimantas V. Adam Stankievič is a priest, writer, actor of the Belarusian revival. *XXI amžius* [XXI century], 2009, no 80, p. 4 (In Lithuanian).

13. Markelov N. Interethnic relations between Belarusians and Poles in the context of the formation of a new state identity in 1921–1939. *Uchenyye zapiski Kazanskogo universiteta. Seriya: Gumanitarnyye nauki* [Scientific notes of Kazan University. Humanities Series], 2017, vol. 159, book 4, pp. 1019–1027 (In Russian).

14. Barinov I. Belarus and Belarusians in Germany's anti-Polish strategy (1915–1939). *Slavyanskiy al'manakh* [Slavic almanac], 2022, no. 1–2, pp. 28–47 (In Russian).

15. Rudling Per Anders. The rise and fall of Belarusian nationalism, 1906–1931. Pittsburgh, University of Pittsburgh Press Publ., 2015. 436 p.

16. Yasui Michihiro. "Hromada's Day" in the Polish Sejm (Feb. 4, 1927). The Belarusian national movement under the early Sanacja Regime. *Gistoryia Belarusi u XX stagoddzi. Pamyatsi prafesara Ivana Koukelia* [History of Belarus in the 20th century. In memory of Professor Ivan Koukel]. Hrodna, JursaPrint Publ., 2017, pp. 67–92.

**Інфармацыя пра аўтара**

**Горны Аляксандр Сяргеевіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, кіраўнік Цэнтра даследавання дыяспар і замежнага беларусазнаўства. Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, Рэспубліка Беларусь). E-mail: litvin.gorny@gmail.com

**Information about the author**

**Gorny Aliaksandr Siargeevich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus, Archeology and Special Historical Disciplines, Head of Center for Diaspora Studies and Foreign Belarusian Studies. Yanka Kupala State University of Grodno (22, Ozheshko str., 230023, Grodno). E-mail: litvin.gorny@gmail.com

*Паступіў 10.09.2023*